Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов
Республики Беларусь 19 июля 1999 г. N 2/62

# ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
**9 ліпеня 1999 г. N 282-З**

# АБ НАРОДНЫМ МАСТАЦТВЕ, НАРОДНЫХ ПРОМЫСЛАХ (РАМЁСТВАХ) У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 15 чэрвеня 1999 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 30 чэрвеня 1999 года

(в ред. Законов Республики Беларусь от 09.11.2009 N 51-З,
от 20.05.2013 N 25-З)

Гэты Закон вызначае асноўныя прынцыпы дзяржаўнага рэгулявання і падтрымкі народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) як неад'емнай часткі нацыянальнай культуры і гісторыі беларускага народа, садзейнічае захаванню традыцый і гарманічнаму развіццю грамадства.

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1. Асноўныя паняцці

Для мэт гэтага Закона выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя паняцці:

народнае мастацтва (народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва) - галіна традыцыйнай народнай культуры, звязаная са стварэннем па-мастацку аформленых прадметаў побыту з выкарыстаннем мясцовых прыродных матэрыялаў;

народныя промыслы (рамёствы) - вытворчасць прадметаў дэкаратыўнага і утылітарнага прызначэння, гістарычна сфарміраваная ў пэўнай мясцовасці і непарыўна звязаная з самабытнымі мастацкімі і рамесніцкімі традыцыямі гэтай мясцовасці;

арганізацыя народных промыслаў (рамёстваў) - камерцыйная арганізацыя любой формы ўласнасці і арганізацыйна-прававой формы, якая займаецца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў) на аснове выкарыстання традыцыйных мастацка-тэхнічных прыёмаў па апрацоўцы натуральных матэрыялаў;
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

вырабы народных промыслаў (рамёстваў) - прадметы дэкаратыўнага і утылітарнага прызначэння, створаныя ў адпаведнасці з традыцыямі народных промыслаў (рамёстваў) з выкарыстаннем натуральных матэрыялаў

і ручной працы;

народны майстар у галіне народнага мастацтва (народны майстар) - фізічная асоба (носьбіт аўтэнтычнай традыцыі ў народным мастацтве), якая творча займаецца стварэннем вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), што характарызуюцца арганічным увасабленнем калектыўнага мастацкага вопыту народа, выразнай этнічнай самабытнасцю і ўяўляюць мастацкую каштоўнасць для сучаснай нацыянальнай культуры;

майстар народных промыслаў (рамёстваў) - фізічная асоба, якая займаецца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), працуе індывідуальна або з'яўляецца штатным работнікам арганізацыі народных промыслаў (рамёстваў).
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

**Артыкул 2. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) і яго задачы**

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і складаецца з Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 1991 года "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь" (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., N 20, арт. 291; Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2004 г., N 87, 2/1031), гэтага Закона і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.
(часть первая статьи 2 в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Задачамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) з'яўляюцца:

рэгуляванне адносін у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) з мэтай іх зберажэння, адраджэння і развіцця;

вызначэнне прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў);

стварэнне гарантый дзяржаўнай падтрымкі народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў);

забеспячэнне і абарона права грамадзян на творчую дзейнасць у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў);

вызначэнне правоў, абавязкаў і адказнасці фізічных і юрыдычных асоб у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў).

**Артыкул 3. Дзяржаўная палітыка ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў)**

Дзяржаўная палітыка ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) у Рэспубліцы Беларусь грунтуецца на прынцыпах:

спалучэння нацыянальных дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў і правоў асобы ў гэтай галіне;

забеспячэння прававой і сацыяльнай абароненасці грамадзян, якія займаюцца народным мастацтвам, народнымі промысламі (рамёствамі);

гарантавання свабоды творчасці ў гэтай галіне;

забеспячэння роўнасці правоў і магчымасцей грамадзян у стварэнні і выкарыстанні вырабаў народных промыслаў (рамёстваў);

развіцця сістэмы пераемнасці традыцый, навучання, накіраванай на далучэнне да каштоўнасцей народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў).

Дзяржаўная палітыка ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) забяспечваецца шляхам:

правядзення мерапрыемстваў у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) у рамках рэалізацыі дзяржаўных праграм захавання і развіцця культуры;

стварэння ўмоў для адраджэння і развіцця традыцый народных промыслаў (рамёстваў), заахвочвання культурнай дзейнасці фізічных і юрыдычных асоб у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў);

садзейнічання развіццю матэрыяльнай базы для дзейнасці народных майстроў, арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў) на аснове выкарыстання традыцыйных мастацка-тэхнічных прыёмаў па апрацоўцы натуральных матэрыялаў (далей - індывідуальныя прадпрымальнікі, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў));

стымулявання дабрачыннай дзейнасці ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў);

садзейнічання развіццю гандлю вырабамі народных промыслаў (рамёстваў), правядзенню выставак, кірмашоў і аўкцыёнаў;

стварэння іншых гарантый у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

(часть вторая статьи 3 в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

**Артыкул 4. Дзяржаўная падтрымка народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў)**

(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Дзяржаўная падтрымка народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў у рамках рэалізацыі дзяржаўных праграм захавання і развіцця культуры, сродкаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама шляхам фінансавання народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 5. Выключаны.**
(статья 5 исключена. - Закон Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

## ГЛАВА 2
## ПРАВЫ ГРАМАДЗЯН У ГАЛІНЕ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА, НАРОДНЫХ ПРОМЫСЛАЎ (РАМЁСТВАЎ)

**Артыкул 6. Правы грамадзян на дзейнасць у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў)**

Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь мае права на творчую дзейнасць у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) у адпаведнасці са сваімі схільнасцямі і здольнасцямі.

Права грамадзяніна займацца творчай дзейнасцю ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) можа ажыццяўляцца як на прафесійнай, так і непрафесійнай (аматарскай) аснове, у тым ліку ў рамках рамесніцкай або прадпрымальніцкай дзейнасці.
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Грамадзяне, якія займаюцца творчай дзейнасцю ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў), маюць права на абарону сваёй дзейнасці і ахову сакрэтаў майстэрства ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб аўтарскім праве і сумежных правах, а таксама свабодна распараджацца вынікамі сваёй працы.
(часть третья статьи 6 в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

**Артыкул 7. Права грамадзян на ўтварэнне грамадскіх аб'яднанняў у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў)**

Грамадзяне, якія працуюць у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў), маюць права ўтвараць па сваёй ініцыятыве творчыя саюзы і іншыя грамадскія аб'яднанні, што маюць на мэце стварэнне найбольш спрыяльных умоў для творчай дзейнасці, развіцця, падтрымкі і папулярызацыі народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў).
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) рэгулюецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб грамадскіх аб'яднаннях.

**Артыкул 8. Выключаны.**
(статья 8 исключена. - Закон Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

**Артыкул 9. Права грамадзян на вываз за межы Рэспублікі Беларусь вынікаў сваёй творчай дзейнасці**

Грамадзяне маюць права вывозіць за межы Рэспублікі Беларусь з мэтай экспанавання, іншых форм публічнага паказу, а таксама на продаж аўтарскія ўзоры і вырабы народных промыслаў (рамёстваў) у парадку, які вызначаецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Пры выездзе за межы Рэспублікі Беларусь грамадзяне маюць права вывозіць створаныя імі ўзоры і вырабы народных промыслаў (рамёстваў) у выпадках, колькасці і парадку, якія ўстанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 3
## НАРОДНЫ МАЙСТАР У ГАЛІНЕ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА І ЯГО ПРАВЫ

### Артыкул 10. Пасведчанне народнага майстра

(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Статус народнага майстра пацвярджаецца пасведчаннем устаноўленага ўзору, што выдаецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб народным майстру, якое зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне народнага майстра выдаецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь на падставе заключэння экспертнай камісіі, якая ствараецца і дзейнічае ў парадку, што вызначаецца гэтым Міністэрствам. Органы дзяржаўнай улады могуць прадастаўляць асобам, якія атрымалі пасведчанне народнага майстра, пэўныя гарантыі і льготы для больш плённага ажыццяўлення іх творчай дзейнасці, садзейнічаць вытворчасці вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), перадачы іх майстэрства вучням.

### Артыкул 11. Правы народнага майстра

Народны майстар мае права на:

абарону сваёй творчай задумы;

экспанаванне і іншыя формы публічнага паказу вынікаў сваёй дзейнасці;

узнагароджанне за публічнае выкарыстанне вынікаў творчай дзейнасці;

набыццё і нарыхтоўку неабходных відаў сыравіны і матэрыялаў;

арэнду памяшканняў для выкарыстання іх у якасці творчых майстэрань у адпаведнасці з заканадаўствам;

доступ да фондаў у сферы культуры;

забеспячэнне ўмоў для творчай дзейнасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі па ахове працы;

работу па працоўнаму дагавору, у тым ліку і за мяжой;

перадачу свайго майстэрства па адпаведным відзе мастацкага рамяства;
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

абарону свайго прафесійнага гонару і годнасці;

іншыя правы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 12. Выключаны.**
(статья 12 исключена. - Закон Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

## ГЛАВА 4
## ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАДТРЫМКА АРГАНІЗАЦЫЙ НАРОДНЫХ ПРОМЫСЛАЎ (РАМЁСТВАЎ) І ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

**Артыкул 13. Арганізацыі народных промыслаў (рамёстваў)**
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

У мэтах вытворчасці, тыражавання і рэалізацыі вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), якія характарызуюцца нацыянальнай самабытнасцю і высокім мастацкім узроўнем, а таксама захавання і развіцця традыцыйных народных промыслаў (рамёстваў), задавальнення духоўна-эстэтычных патрэб грамадзян, удасканалення традыцыйных рамесніцкіх тэхналогій і індывідуальнага майстэрства народных майстроў у Рэспубліцы Беларусь ствараюцца і дзейнічаюць арганізацыі народных промыслаў (рамёстваў).
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Часть вторая статьи 13 исключена. - Закон Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З.

**Артыкул 14. Дзяржаўная падтрымка арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў)**

(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Арганізацыі народных промыслаў (рамёстваў) і іх асноўныя вытворчыя падраздзяленні (цэхі, участкі, брыгады), а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), забяспечваюцца фінансавай і іншымі відамі дзяржаўнай падтрымкі.

Дзяржаўная падтрымка арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), ажыццяўляецца для забеспячэння магчымасцей выканання імі іх вытворчых задач.

Аднясенне прадукцыі арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), да вырабаў народных промыслаў (рамёстваў) праводзіцца ў адпаведнасці з рашэннем экспертнай камісіі і на падставе пераліку вырабаў народных промыслаў (рамёстваў) прызнанай

мастацкай вартасці, зацверджанага Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Парадак стварэння і дзейнасці экспертнай камісіі па аднясенні прадукцыі да вырабаў народных промыслаў (рамёстваў) вызначаецца Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 15. Асноўныя напрамкі дзяржаўнай падтрымкі арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў)**
(название в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Дзяржаўная падтрымка арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), ажыццяўляецца шляхам:
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

стварэння спрыяльных умоў для выкарыстання гэтымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі фінансавых, матэрыяльна-тэхнічных і інфармацыйных рэсурсаў, а таксама навукова-тэхнічных распрацовак і тэхналогій;
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

садзейнічання знешнеэканамічнай і іншай звязанай з ёю дзейнасці, уключаючы пашырэнне і развіццё гандлёвых, навукова-тэхнічных, вытворчых і інфармацыйных сувязей гэтых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў;
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

арганізацыі падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў для гэтых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў.
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

**Артыкул 16. Вытворча-тэхналагічная падтрымка арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў)**
(название в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы распрацоўваюць і ажыццяўляюць комплекс мерапрыемстваў па садзейнічанню ў забеспячэнні арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), абсталяваннем і сучаснымі тэхналогіямі для падрыхтоўчых працэсаў і арганізацыі вытворчасці.
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь прадастаўляюць арганізацыям народных

промыслаў (рамёстваў) і індывідуальным прадпрымальнікам, якія займаюцца вытворчасцю вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), магчымасць карыстацца на аснове дагавораў арэнды на льготных умовах будынкамі, абсталяваннем, вытворчымі і службовымі памяшканнямі, іншай маёмасцю, якая знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці.
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

**Артыкул 17. Выключаны.**
(статья 17 исключена. - Закон Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

**Артыкул 18. Падтрымка знешнеэканамічнай дзейнасці арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) і індывідуальных прадпрымальнікаў**
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Органы дзяржаўнай улады садзейнічаюць удзелу арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) і індывідуальных прадпрымальнікаў у рэалізацыі праграм і праектаў у сферы знешнеэканамічнай дзейнасці і ў міжнародных выстаўках і кірмашах, заахвочваюць развіццё гандлю вырабамі народных промыслаў (рамёстваў) у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 19. Захаванне профілю арганізацыі народных промыслаў (рамёстваў)**

(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Арганізацыя народных промыслаў (рамёстваў) захоўвае свой профіль незалежна ад змены яе ўласніка, а таксама пры правядзенні санацыі такой арганізацыі.

## ГЛАВА 5
## НАВУЧАННЕ ТРАДЫЦЫЙНЫМ НАРОДНЫМ ПРОМЫСЛАМ (РАМЁСТВАМ), ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ, НАВУКОВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

**Артыкул 20. Навучанне традыцыйным народным промыслам (рамёствам)**

Навучанне традыцыйным народным промыслам (рамёствам) ажыццяўляецца шляхам:
передачы народнымі майстрамі свайго вопыту работы і авалодання іх вопытам з мэтай забеспячэння аўтэнтычнасці традыцый;
знаёмства з традыцыйнымі народнымі промысламі (рамёствамі), са

спосабамі вытворчасці асобных відаў вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), з мастацкімі прыёмамі народных промыслаў (рамёстваў) пры атрыманні дашкольнай, агульнай сярэдняй адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

атрымання прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі і дадатковай адукацыі дарослых;
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

набыцця навыкаў у галіне традыцыйных народных промыслаў (рамёстваў) самастойна, у тым ліку ў дамах рамёстваў.
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

абзацы шестой - седьмой исключены. - Закон Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З.

Навучанне традыцыйным народным промыслам (рамёствам) фінансуецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 21. Навуковыя даследаванні ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў)**

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі вызначае прыярытэтныя напрамкі навуковых даследаванняў у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) і ажыццяўляе агульнае кіраванне імі.

У правядзенні навуковых даследаванняў па праблемах народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) прымаюць удзел спецыялісты ў галіне культуры, а таксама іншыя спецыялісты, удзел якіх неабходны для правядзення гэтых даследаванняў.

У мэтах даследавання народнага мастацтва, тэхналогій народных промыслаў (рамёстваў) і забеспячэння навучальнага працэсу ва ўстановах вышэйшай адукацыі і ўстановах культуры Рэспублікі Беларусь могуць стварацца навукова-даследчыя лабараторыі.
(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

## ГЛАВА 6
## ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА І РАСПАЎСЮДЖВАННЕ ВЫРАБАЎ НАРОДНЫХ ПРОМЫСЛАЎ (РАМЁСТВАЎ)

**Артыкул 22. Папулярызацыя народнага мастацтва і распаўсюджванне вырабаў народных промыслаў (рамёстваў)**

(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Органы дзяржаўнага кіравання культурай, арганізацыі народных промыслаў (рамёстваў), індывідуальныя прадпрымальнікі і грамадскія аб'яднанні ў галіне народных промыслаў (рамёстваў) сумесна з

зацікаўленымі садзейнічаюць папулярызацыі народнага мастацтва і распаўсюджванню вырабаў народных промыслаў (рамёстваў) з дапамогай сродкаў масавай інфармацыі, праз рэкламна-выдавецкую дзейнасць, шляхам правядзення выставак, кірмашоў, аўкцыёнаў, дэманстрацыі вырабаў, устанаўлення нацыянальных прэмій і дыпломаў у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў), а таксама іншымі спосабамі, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 23. Нацыянальныя выстаўкі твораў народнага мастацтва і вырабаў народных промыслаў (рамёстваў)**

У мэтах стымулявання развіцця народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў), папулярызацыі гэтай галіны рэгулярна праводзяцца нацыянальныя выстаўкі твораў народнага мастацтва і вырабаў народных промыслаў (рамёстваў).

**Артыкул 24. Музеі**

(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

У мэтах збірання, захоўвання, вывучэння і папулярызацыі вырабаў народных промыслаў (рамёстваў) могуць ствараца музеі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 25. Выключаны.**
(статья 25 исключена. - Закон Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

**Артыкул 26. Дэманстрацыя твораў народнага мастацтва і ўзораў вырабаў народных промыслаў (рамёстваў) у памяшканнях дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь за мяжой**

Дзяржаўныя органы садзейнічаюць распаўсюджванню дасягненняў народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) Рэспублікі Беларусь за мяжой. З гэтай мэтай у памяшканнях дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь за мяжой дэманструюцца творы народнага мастацтва і ўзоры вырабаў народных промыслаў (рамёстваў).

**Артыкул 27. Прэміі, дыпломы і стыпендыі ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў)**

У мэтах стымулявання развіцця народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў), іх навуковых даследаванняў, падтрымкі самабытных традыцый, а таксама вядучых народных майстроў, майстроў народных промыслаў (рамёстваў), творчай моладзі, якая працуе ў гэтай галіне

культуры, дзяржаўныя органы ўстанаўліваюць спецыяльныя прэміі, дыпломы і стыпендыі.

**Артыкул 28. Выключаны.**
(статья 28 исключена. - Закон Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

**Артыкул 29. Архіўныя дакументы па народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах)**

(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Архіўным дакументам па народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах), калі яны маюць гісторыка-культурную значнасць, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь надаецца статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Арганізацыі, якім належаць гэтыя архіўныя дакументы, забяспечваюць магчымасць доступу для карыстання імі ў навуковых і творчых мэтах.

## ГЛАВА 7
## КУЛЬТУРНЫ АБМЕН І МІЖНАРОДНЫЯ СУВЯЗІ

**Артыкул 30. Культурны абмен і міжнародныя сувязі Рэспублікі Беларусь з замежнымі краінамі ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў)**

(в ред. Закона Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

Дзяржаўныя органы садзейнічаюць пашырэнню кола суб'ектаў міжнародных сувязей у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў), заахвочваюць самастойны непасрэдны ўдзел у культурным абмене народных майстроў, арганізацый народных промыслаў (рамёстваў) Рэспублікі Беларусь з аналагічнымі арганізацыямі замежных краін.

**Артыкул 31. Міжнародныя дагаворы ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў)**

Нормы ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў), што змяшчаюцца ў міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, якія ўступілі ў сілу, з'яўляюцца часткай заканадаўства Рэспублікі Беларусь, падлягаюць непасрэднаму прымяненню на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, акрамя выпадкаў, калі з міжнароднага дагавора вынікае, што для прымянення такіх норм патрабуецца выданне ўнутрыдзяржаўнага акта, і маюць сілу таго прававога акта, якім выяўлена згода Рэспублікі Беларусь на абавязковасць для яе адпаведнага міжнароднага дагавора.

**Артыкул 32. Выключаны.**
(статья 32 исключена. - Закон Республики Беларусь от 20.05.2013 N 25-З)

## ГЛАВА 8
## АДКАЗНАСЦЬ ЗА ПАРУШЭННЕ ЗАКАНАДАЎСТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ НАРОДНЫМ МАСТАЦТВЕ, НАРОДНЫХ ПРОМЫСЛАХ (РАМЁСТВАХ)

**Артыкул 33. Адказнасць за парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах)**

За парушэнне палажэнняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) вінаватыя нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 9
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 34. Уступленне ў сілу гэтага Закона**

Гэты Закон уступае ў сілу з дня яго апублікавання.

**Артыкул 35. Прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам**

Да прывядзення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам яно прымяняецца ў той частцы, у якой не супярэчыць гэтаму Закону, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін забяспечыць прывядзенне заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам, а таксама прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі яго палажэнняў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка